	2011/2012	52	52	
	2012/2013	49	49	
	2013/2014	40	40	
gm. Dubicze Cerkiewne				
Publiczne Gimnazjum w Dubiczach Cerkiewnych / Zespół Szkół w Dubiczach Cerkiewnych	2006/2007	43	34	
	2007/2008	39	33	
	2008/2009	47	40	
	2009/2010	52	43	
	2010/2011	51	42	
	2011/2012	41	36	
	2012/2013	37	33	
	2013/2014	31	29	
gm. Hajnówka				
Publiczne Gimnazjum przy Zespole Szkół w Dubinach	2005/2006	111	37	
	2006/2007	114	42	
	2007/2008	103	46	
	2008/2009	112	37	
	2009/2010	105	37	
	2010/2011	106	37	
	2011/2012	91	42	
	2012/2013	83	39	
	2013/2014	62	42	

gm. Kleszczele				
Gimnazjum w Kleszczelach / Zespół Szkół w Kleszczelach	2006/2007	90	22	
	2007/2008	86	18	
	2008/2009	87	12	
	2009/2010	82	11	
	2010/2011	74	8	
	2011/2012	63	9	
	2012/2013	61	7	
	2013/2014	63	7	
gm. Narew				
Gimnazjum im. Abp. gen. dyw. Mirona Chodakowskiego w Narwi	2006/2007	122	37	
	2007/2008	116	34	
	2008/2009	120	31	
	2009/2010	119	31	
	2010/2011	124	35	
	2011/2012	100	28	
	2012/2013	93	27	
	2013/2014	75	22	
gm. Narewka				
Publiczne Gimnazjum w Narewce / Zespół Szkół w Narewce	2006/2007	153	43	
	2007/2008	39	40	
	2008/2009	57	33	
	2009/2010	115	29	
	2010/2011	103	27	
	2011/2012	92	28	
	2012/2013	74	25	
	2013/2014	68	29	

Szkoły ponadgimnazjalne z językiem białoruskim w latach 2002/2003-2012/2013

Szkoła gimnazjalna	Rok szkolny	Liczba uczniów ogółem w szkole	Liczba uczniów uczących się języka białoruskiego	Uwagi
m. Białystok				
III Liceum Ogólnokształcące w Białymstoku	2007/2008	851	17	
	2008/2009	848	19	
	2009/2010	825	13	
	2010/2011	871	8	
	2011/2012	874	13	
	2012/2013	889	13	
	2013/2014	822	16	
pow. Bielsk Podlaski				
m. Bielsk Podlaski				
II Liceum Ogólnokształcące z Białoruskim Językiem Nauczania w Bielsku Podlaskim	2006/2007	444	444	
	2007/2008	431	431	
	2008/2009	420	420	
	2009/2010	424	424	
	2010/2011	399	399	
	2011/2012	385	385	
	2012/2013	361	361	
	2013/2014	336	336	
pow. Hajnówka				
m. Hajnówka				
II Liceum Ogólnokształcące z Dodatkową Nauką Języka Białoruskiego w Hajnówce	2005/2006	376	376	
	2006/2007	366	366	
	2007/2008	356	356	
	2008/2009	342	342	
	2009/2010	352	352	
	2010/2011	346	346	
	2011/2012	350	350	
	2012/2013	329	329	
	2013/2014	320	320	

Załącznik Nr 2

Rys historyczny szkolnictwa z językiem białoruskim (opracowany na podstawie tekstu przesłanego przez mniejszość białoruską)

Powszechne szkolnictwo polskie i białoruskie na Białostocczyźnie zaczęło powstawać dopiero w okresie I wojny światowej, kiedy niemieckie władze okupacyjne wprowadziły sprzyjającą politykę narodowościową na zachodnich terenach imperium rosyjskiego. Na tworzenie się sieci szkół białoruskich znaczący wpływ wywarło tzw. „bieżeństwo", czyli masowa ewakuacja na wschód w sierpniu 1915 r. głównie prawosławnej ludności białoruskiej i pierwsza fala jej powrotów w 1918 r. Dlatego w latach 1916-1918 utworzono szkoły białoruskie tylko w nielicznych miejscowościach: Białymstoku, Doratynce, Trześciance i Tyniewiczach Wielkich (gm. Narew), Grabowcu (gm. Dubicze Cerkiewne), Krynkach, Nowosadach (gm. Hajnówka), Morzu (gm. Czyże), Olszy (gm. Dąbrowa Białostocka), Słoji (gm. Szudziałowo), Studziankach (gm. Supraśl), Starym Lewkowie (gm. Narewka). Jednakże już w 1919 r. władze polskie, które po wycofaniu się wojsk niemieckich przejęły kontrolę nad Białostocczyzną, w trybie zarządzeń administracyjnych zlikwidowały szkoły białoruskie.

Brak w okresie międzywojennym na Białostocczyźnie szkolnictwa białoruskiego spowodował, iż Białorusini w końcu lat trzydziestych XX w. byli społecznością bardzo słabo edukowaną.

Zasadnicze zmiany w organizacji systemu szkolnego na Białostocczyźnie nastąpiły w końcu 1939 r., po zajęciu regionu przez ZSRR i dołączeniu do Białoruskiej Socjalistycznej Republiki Radzieckiej. We wsiach utworzono wówczas sieć szkół białoruskich. W Białymstoku utworzono Instytut Pedagogiczny, którego zadaniem było przygotowanie kadry nauczycielskiej. Działający dwa lata model szkolnictwa radzieckiego miał cel ideologiczny, którym było uformowanie „człowieka radzieckiego", jednak na poziomie podstawowym dawał młodym Białorusinom podstawy wiedzy w języku ojczystym.

W okresie okupacji niemieckiej na Białostocczyźnie działało na wpół legalnie kilkadziesiąt elementarnych szkółek białoruskich, gdyż lokalne władze cywilne pozwoliły tworzyć prywatne placówki utrzymujące się na koszt rodziców.

Z chwilą likwidacji na Białostocczyźnie okupacji niemieckiej w lipcu 1944 r. rozpoczęło się odradzanie życia społecznego i w wielu miejscowościach ludność polska i białoruska spontanicznie zaczęła organizować szkoły. Według Jerzego Turonka we wrześniu 1944 r. na terenach będących pod władzą Polskiego Komitetu Wyzwolenia Narodowego istniały 93 powszechne szkoły z językiem białoruskim: 81 z językiem wykładowym, 9 dwujęzycznych polsko-białoruskich i 3 z językiem białoruskim jako jeden z przedmiotów. Natomiast w ramach szkolnictwa ponadpodstawowego zostały utworzone 3 białoruskie gimnazja: w Białymstoku, Bielsku Podlaskim i Hajnówce, oraz jedno liceum w Bielsku Podlaskim. Jednakże władze bardzo szybko zlikwidowały te placówki. Już w sierpniu 1945 r. nie wyrażono zgody na działalność gimnazjum hajnowskiego, a w czerwcu 1947 r. znikły już nieliczne ostanie podstawówki białoruskie.

Dopiero decyzja centralnego kierownictwa Polskiej Zjednoczonej Partii Robotniczej z końca czerwca 1949 r. dała możliwość odtworzenia szkolnictwa białoruskiego, które działałoby w ramach ogólnokrajowego systemu edukacji. W czasie przerwy wakacyjnej, pod wpływem wytycznych Ministerstwa Oświaty, przeprowadzono we wschodniej Białostocczyźnie pośpieszną akcję przygotowawczą i już od września 1949 r. rozpoczęły pracę 24 szkoły podstawowe z białoruskim językiem wykładowym (21 w ówczesnym pow. bielskim, 2 w pow. białostockim i 1 w pow. sokólskim). Uczyło się w nich ok. 2100 dzieci. Ponadto władze oświatowe wykazywały, że do 10 placówek wprowadzono język białoruski jako przedmiot, na który uczęszczało ok. 1400 uczniów. Od września 1949 r. w Bielsku Podlaskim i Hajnówce rozpoczęły działalność dwa licea ogólnokształcące z białoruskim językiem nau-

czania. Powołanie do życia średnich szkół białoruskich miało wyraźny cel propagandowy. Władzom zależało na tym, by „uspokoić ludność białoruską, zwalczyć jej uprzedzenia" — jak to motywowało wojewódzkie kierownictwo PZPR. Władze polityczne chciały „przekonać ludność szkół wiejskich, że po ukończeniu szkoły białoruskiej 7-klasowej uczniowie tych szkół będą mogli dalej się uczyć w szkole średniej białoruskiej". Wyraźnym zamiarem kierownictwa partyjnego było tworzenie szkół białoruskich na wsi, co wpisywało się w politykę rolną państwa, w której jako główne zadanie wskazano uspółdzielczenie rolnictwa. Miało to być zachętą dla ludności białoruskiej, sposobem na przeciągnięcie tej mniejszości narodowej na stronę „władzy ludowej". W pełni kontrolowane szkolnictwo stanowiło doskonały instrument realizacji polityki państwa. Za takim wnioskiem przemawia też wprowadzenie na początku lat pięćdziesiątych XX w. języka białoruskiego do klas licealnych Państwowej Szkoły Podstawowej i Liceum Ogólnokształcącego w Michałowie. Podobnie było także z utworzeniem klas z językiem białoruskim w Liceum Pedagogicznych w Bielsku Podlaskim (działało w latach 1950-1971) i Liceum dla Wychowawczyń Przedszkoli z Białoruskim Językiem Nauczania w Bielsku Podlaskim (działało w latach 1951-1957). Do końca lat pięćdziesiątych XX w. powstała sieć szkół z językiem białoruskim obejmująca pięć wschodnich powiatów woj. białostockiego: białostocki, bielski, hajnowski, siemiatycki i sokólski. W tym czasie następowała już tendencja odchodzenia od wykładowego języka na rzecz przedmiotu „język białoruski". Zmiany te ukazuje poniższa tabela.

Typ szkoły	1952		1955		1958	
	Szkół	Uczniów	Szkół	Uczniów	Szkół	Uczniów
Szkoły podstawowe z białoruskim językiem nauczania	66	5.742	58	4.633	47	3.369
Szkoły podstawowe z polskim językiem nauczania i przedmiotem język białoruski	87	5.972	111	6.284	126	6.452
Ogółem	153	11.714	169	10.917	173	9.821

Należy zauważyć, iż nie wprowadzono języka białoruskiego do żadnej szkoły w Białymstoku — stolicy województwa. Miało to swój negatywny wpływ na obecność języka białoruskiego w szkolnictwie powiatu białostockiego i sokólskiego, w których najszybciej zaprzestano prowadzenia innych zajęć w tym języku, a w pow. sokólskim nawet zaprzestawano prowadzić zajęcia języka białoruskiego, który na wsi funkcjonował jako „mowa prosta".


Ta część szkolnictwa polskiego, w której funkcjonował język białoruski, od samego początku, czyli od września 1949 r., borykała się z podstawowymi problemami: brakiem profesjonalnej kadry nauczycielskiej, brakiem podręczników i pomocy naukowych, istniejącymi złymi warunkami lokalowymi. Ponadto powszechna wówczas była organizacja pracy w szkołach w klasach łączonych. W tak niesprzyjających warunkach wystarczyła więc tylko zmiana polityki narodowościowej dokonana na początku lat siedemdziesiątych XX w., kiedy do władzy w Polsce doszła ekipa Edwarda Gierka, by dziesięciolecie stagnacji lat sześćdziesiątych przemieniło się w dotkliwy kryzys. Zainicjowało ten kryzys pismo z Ministerstwa Oświaty i Szkolnictwa Wyższego z lutego 1971 r., będące reakcją na podanie rodzica — osadnika narodowości polskiej, który przybył do Nowego Berezowa i podjął pracę w tamtejszym Państwowym Gospodarstwie Rolnym. Ministerstwo wprowadziło wówczas zasadę organizacji nauki języka białoruskiego na podstawie corocznie składanych przez rodziców deklaracji. Wprowadzenie obowiązku wypełnienia corocznych deklaracji oraz marginalizacja roli samych zajęć z języka białoruskiego ze strony Ministerstwa Oświaty i Szkolnictwa Wyższego, doprowadziły w ciągu kilku lat do upadku nauczania języka białoruskiego w szkołach Białostocczyzny. Do likwidacji sieci szkół z językiem białoruskim w niektórych gminach

przyczyniła się także realizacja reformy oświatowej i tworzenie tzw. szkół zbiorczych, gdyż wraz z zamykaniem małych placówek i przenoszeniem dzieci do wspomnianych szkół zbiorczych, nie umożliwiano im kontynuowania nauki języka białoruskiego. W efekcie w roku szkolnym 1975/76 język białoruski był nauczany tylko w 63 szkołach podstawowych i uczyło się go 4.460 dzieci. A pięć lat później placówki takie pozostały jedynie w 41 miejscowościach leżących na terenie byłych trzech powiatów: białostockiego — 2 szkoły z 98 uczniami, bielskiego — 14 szkół z 1.296 uczniami i hajnowskiego — 25 szkół z 2.036 uczniami. Na terenie byłych powiatów siemiatyckiego i sokólskiego zaprzestano nauczania języka białoruskiego. W latach siedemdziesiątych XX w. w miarę ustabilizowana sytuacja istniała tylko w dwu liceach z językiem białoruskim w Bielsku Podlaskim i Hajnówce, do których uczęszczało corocznie przeciętnie około siedmiuset uczniów. Chociaż i na tym poziomie edukacji nastąpiła redukcja, gdyż w 1974 roku przerwano nauczanie języka białoruskiego w Liceum Ogólnokształcącym w Michałowie.

Rewolucja „Solidarności" w 1980 r. spowodowała, iż działacze Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego odważyli się wysunąć pod adresem władz pewne postulaty w celu poprawy sytuacji nauczania języka białoruskiego. Jednak stan wojenny przerwał tę inicjatywę środowiska białoruskiego i dopiero zmiana systemu politycznego w Polsce po 1989 r. otworzyła nowy etap nauczania języka białoruskiego w polskich szkołach.


Załącznik Nr 3
Lista rzeczoznawców do spraw podręczników języka białoruskiego

1. **dr. Jadwiga GŁUSZKOWSKA-BABICKA** Rekomendacja: Uniwersytet Warszawski Adres do korespondencji: ul. Słoneczna 11, 05-520 KONSTANCIN-JEZIORNA, Telefon: (22) 756-43-57 e-mail: jaglusz@uw.edu.pl
2. **dr. Teresa CHYLAK-SCHRODER** Rekomendacja: Uniwersytet Warszawski Adres do korespondencji: ul. Żabie Oczko 1 m. 8, 05-822 MILANÓWEK, Telefon: (22) 724-94-00
3. **prof. dr hab. Mieczysław JACKIEWICZ** Rekomendacja: Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu Adres do korespondencji: ul. Żołnierska 12B m. 37, 10-559 OLSZTYN, Telefon: 665 399 615 e-mail: mjackiewicz@gmail.com
4. **dr. Teresa JASIŁSKA-SOCHA** Rekomendacja: Uniwersytet Warszawski Adres do korespondencji: ul. Opaczewska 42 m. 62, 02-372 WARSZAWA, Telefon: (22) 823-76-07 e-mail: tjasińsk@uw.edu.pl
5. **prof. dr hab. Michał KONDRATIUK** Rekomendacja: Białoruskie Towarzystwo Społeczno-Kulturalne Adres do korespondencji: ul. Conrada 18 m. 265, 15-325 BIAŁYSTOK, Telefon: 745-73-77
6. **dr. Nadzieja PANASIUK** Rekomendacja: Uniwersytet Warszawski Adres do korespondencji: ul. Dembego 17A m. 36, 02-796 WARSZAWA, Telefon: (22) 649-12-53 e-mail: nadpal@wp.pl
7. **mgr Tamara RUSACZYK** Rekomendacja: Zespół Placówek Doskonalenia Nauczycieli Białystok Adres do korespondencji: ul. Poświętna 13 m. 10, 17-100 BIELSK PODLASKI e-mail: tamara.rusaczyk@wp.pl









ПАДРУЧНІКІ І ДАПАМОЖНІКІ

З 4 ліпеня мінулага года я ўдзельнічаю ў працах „grupy roboczej Komisji Wspólnej Rządu i Mniejszości Narodowych i Etnicznych do spraw podręczników dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz języka regionalnego", якую арганізавала Міністэртва адміністрацыі і лічбавізацыі. У працах групы прымаюць удзел прадстаўнікі гэтага міністэрства і Міністэрства нацыянальнай адукацыі, а таксама прадстаўнікі нацыянальных і рэгіянальных меншасцей Польшчы. Адбыліся ўжо тры сустрэчы групы. Інфармацыі пра іх знойдзеце на сайце міністэрства: **http://mniejszosci.narodowe.mac.gov.pl/mne/komisja-wspolna/grupy-robocze/podreczniki-dla-mniejsz**.

На сайце Міністэрства адукацыі **http://www.men.gov.pl/podreczniki/dopuszczone_lista2.php** знойдзеце спіс падручнікаў згодных з „nową podstawą programową", якімі могуць карыстацца настаўнікі.

Пакуль што, маем падручнікі і дыдактычныя матэрыялы да першага адукацыйнага этапу (класы I-III пачатковай школы).

Аб'яднанне ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА выдала:

— дзве версіі паказнога алфавіта,
— дыскі з беларускімі песнямі для I, II і III класаў,
— „Сцэнарыі ўрокаў беларускай мовы для I класа пачатковай школы" (дапаможнік).,
— „Лемантар. Падручнік да навукі беларускай мовы для II класа пачатковай школы",
— „Кругагод. Падручнік да навукі беларускай мовы для III класа пачатковай школы".

Прыпамінаем, што падручнікі заказвае дырэктар школы ў Кураторыі асветы ў Беластоку і трэба іх потым адтуль забраць.

У сядзібе нашага Аб'яднання можаце атрымаць:

— настольную арфаграфічную гульню „У або ў" (гульня для школьнікаў, якія вывучаюць правапіс „у" і „ў"),
— настольную гульню „Ад Буга за Нарву, або падарожжа з Мельніка ў Ячна" (гульня для старэйшых вучняў, якія гуляючы вывучаюць тапаграфію і цікавыя месцы Беласточчыны),
— дыскі з беларускімі песнямі для I, II і III класаў,
— дыскі: „Васількі — валошкі" з песнямі на словы Віктара Шведа „Сінязорка" і „Звярынкі з глыбінкі" з песнямі з нашага тэатральнага гуртка.

На нашым сайце знойдзеце новы паказны алфавіт і тэатральныя сцэнарыі.

ЮРЫДЫЧНЫ АГЛЯД

Хочаце падтрымоўваць пачуццё нацыянальнай тоеснасці маладых беларусаў, нашай нацыянальнай меншасці? Хочаце, каб вашыя дзеці пазнавалі сваё роднае, ганарыліся нашай спадчынай? А можа хочаце арганізаваць сваім дзеткам навучанне беларускай мовы? Хачу напомніць пра юрыдычныя законы, якія абавязваюць усіх, хто займаецца навучаннем мовы нацыянальных і этнічных меншасцей у Польшчы.

Каб дзеці маглі вывучаць родную мову трэба іх запісаць у школу, дзе вядзецца такое навучанне

***§ 2.1.** Naukę języka mniejszości lub języka regionalnego w przedszkolu oraz naukę języka mniejszości lub języka regionalnego i naukę własnej historii i kultury w szkole organizuje odpowiednio dyrektor przedszkola lub szkoły, na pisemny wniosek rodziców (prawnych opiekunów) ucznia, składany na zasadzie dobrowolności.*

***2.** Wniosek, o którym mowa w ust. 1, składa się:*
1) dyrektorowi przedszkola przy zgłoszeniu dziecka do przedszkola;
2) dyrektorowi szkoły przy zgłoszeniu ucznia do szkoły albo w toku nauki w szkole w terminie do dnia 30 kwietnia.[1]

Трэба памятаць пра колькасць дзяцей

***§ 5.** Oddziały (...) są organizowane, jeżeli na naukę języka mniejszości lub języka regionalnego zostanie zgłoszonych:*
1) w przedszkolu na poziomie danego oddziału — co najmniej 7 dzieci;
2) w szkole podstawowej i gimnazjum na poziomie danej klasy — co najmniej 7 uczniów;
3) w szkole ponadgimnazjalnej na poziomie danej klasy — co najmniej 14 uczniów.[2]

але

***§ 6.** W przypadku gdy liczba zgłoszonych uczniów jest mniejsza niż określona w § 5 pkt 2 i 3, nauczanie języka mniejszości lub języka regionalnego w szkołach organizuje się w grupach międzyoddziałowych lub międzyklasowych, z tym że:*
1) grupa międzyoddziałowa, utworzona z uczniów różnych oddziałów na poziomie danej klasy, nie może liczyć mniej niż 7 uczniów w szkole podstawowej i gimnazjum oraz 14 uczniów w szkole ponadgimnazjalnej;
2) grupa międzyklasowa, utworzona z uczniów różnych klas, w której nauczanie odbywa się według organizacji nauczania w klasach łączonych, nie może liczyć mniej niż 3 i więcej niż 14 uczniów.

***§ 7.** W uzasadnionych przypadkach, za zgodą organu prowadzącego przedszkole lub szkołę, liczba uczniów w oddziałach, grupach międzyoddziałowych lub międzyklasowych może być mniejsza niż określona w § 5 i 6.*[3]

Не забывайце пра колькасць вучняў.

***§ 8. 2.** Liczba uczniów w zespołach międzyprzedszkolnym lub międzyszkolnym nie może być mniejsza niż 3 i większa niż 20.*

Памятайце, што ўрокі беларускай мовы як мовы нацыянальнай меншасці лічацца абавязковымі для запісаных вучняў.

***3.** Wniosek, o którym mowa w ust. 1, dotyczy odpowiednio całego okresu, na który dziecko jest przyjmowane do przedszkola, oraz całego okresu nauki ucznia w szkole.*[4]
***4.** Złożenie wniosku (...), jest równoznaczne z:*
1) w przypadku nauki języka mniejszości



Аліна ВАЎРАНЮК

[1] Rozporządzenie Ministra Edukacji Narodowej z dnia 14 listopada 2007 r. w sprawie warunków i sposobu wykonywania przez przedszkola, szkoły i placówki publiczne zadań umożliwiających podtrzymywanie poczucia tożsamości narodowej, etnicznej i językowej uczniów należących do mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym.
[2] як вышэй
[3] як вышэй
[4] як вышэй

lub języka regionalnego — zaliczeniem tych zajęć do obowiązkowych zajęć edukacyjnych ucznia;

2) w przypadku nauki własnej historii i kultury — zaliczeniem tych zajęć do dodatkowych zajęć edukacyjnych ucznia.[5]

Адзнака па беларускай мове мае ўплыў на прамоцыю вучня і заканчэнне школы, яна ўлічваецца да сярэдняй адзнак і яе трэба запісаць на грамаце (świadectwie) там, дзе і астатнія адзнакі па абавязковых прадметах.

Адзнака па „ўласнай гісторыі і культуры" ўлічваецца да сярэдняй адзнак і яе трэба запісаць на грамаце) там, дзе і астатнія адзнакі па дадатковых прадметах. Яна не ўплывае на прамоцыю вучня і заканчэнне школы.

Нельга забываць, колькі гадзін вызначана законамі на нашыя ўрокі.

***§ 8.3.** Nauczanie języka mniejszości lub języka regionalnego w zespole międzyprzedszkolnym lub międzyszkolnym prowadzi się w wymiarze 3 godzin tygodniowo.*

3. W szkołach lub oddziałach z dodatkową nauką języka mniejszości lub języka regionalnego prowadzoną w formie odrębnych zajęć:

***1)** w klasach I-III szkoły podstawowej (I etap edukacyjny — edukacja wczesnoszkolna):*

a) w trzyletnim okresie nauczania — minimalny wymiar godzin nauki języka mniejszości lub języka regionalnego wynosi 290 godzin,

b) tygodniowy wymiar godzin zajęć, o których mowa w lit.a, dla uczniów poszczególnych klas wynosi:

- klasa I — 3 godziny,
- klasa II — 3 godziny,
- klasa III — 3 godziny;

***2)** w klasach IV- VI szkoły podstawowej (II etap edukacyjny):*

a) w trzyletnim okresie nauczania:

- minimalny wymiar godzin nauki języka mniejszości lub języka regionalnego wynosi 290 godzin,

- minimalny wymiar godzin własnej historii i kultury wynosi 30 godzin,

b) tygodniowy wymiar godzin zajęć, o których mowa w lit.a, dla uczniów poszczególnych klas wynosi:

- klasa IV — 3 godziny,
- klasa V — 4 godziny,
- klasa VI — 3 godziny;

***3)** w gimnazjum (III etap edukacyjny):*

a) w trzyletnim okresie nauczania:

- minimalny wymiar godzin nauki języka mniejszości lub języka regionalnego wynosi 290 godzin,

- minimalny wymiar godzin własnej historii i kultury wynosi 30 godzin,

b) tygodniowy wymiar godzin zajęć, o których mowa w lit.a, dla uczniów poszczególnych klas wynosi:

- klasa I — 3 godziny,
- klasa II — 4 godziny,
- klasa III — 3 godziny;

***5)** w liceum ogólnokształcącym (IV etap edukacyjny):*

a) w trzyletnim okresie nauczania:

- minimalny wymiar godzin nauki języka mniejszości lub języka regionalnego w zakresie podstawowym wynosi 270 godzin,

- minimalny wymiar godzin własnej historii i kultury wynosi 30 godzin,

b) tygodniowy wymiar godzin zajęć, o których mowa w lit.a, dla uczniów poszczególnych klas wynosi:

- klasa I — 3 godziny,
- klasa II — 4 godziny,
- klasa III — 3 godziny.

***4.** Na naukę języka mniejszości lub języka regionalnego w zakresierozszerzonym należy przeznaczyć dodatkowo (...):*

***1)** w liceum ogólnokształcącym — co najmniej 180 godzin w trzyletnim okresie nauczania.*

[5] Rozporządzenie Ministra Edukacji Narodowej z dnia 4 kwietnia 2012 r. zmieniające rozporządzenie w sprawie warunków i sposobu wykonywania przez przedszkola, szkoły i placówki publiczne zadań umożliwiających podtrzymywanie poczucia tożsamości narodowej, etnicznej i językowej uczniów należących do mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym.

Можна таксама ўвесці навуку геаграфіі.

§ 8b. Szkoła może prowadzić naukę geografii państwa, z którego obszarem kulturowym utożsamia się mniejszość narodowa, w wymiarze po 15 godzin na II, III i IV etapie edukacyjnym, w ramach godzin do dyspozycji dyrektora szkoły (...) lub godzin, które może przyznać, na wniosek dyrektora szkoły, organ prowadzący szkołę.

Вядома ўсе ўрокі адбываюцца на аснове дапушчаных у карыстанне праграмаў і падручнікаў.

Аліна ВАЎРАНЮК

ЗМЕНЫ Ў МАТУРАЛЬНЫМ ЭКЗАМЕНЕ З 2015 ГОДА

Адным з вынікаў рэформы адукацыйнай сістэмы напрыканцы мінулага стагоддзя былі змены ў экзамене на атэстат сталасці. Апрача формулы памянялі таксама яго назву на матуральны экзамен, які ўпершыню здавалі вучні звышгімназіяльных школ ў 2005 годзе. Паўсюдна прынялася назва «новая матура», хіба таксама таму, каб адрозніць яе ад старой матуры, якая яшчэ паралельна функцыянавала некалькі добрых гадоў.

Рэформы ў адукацыі адбываюцца пастаянна і наступіў час на мадыфікацыю матуральнага экзамену. Галоўная яе мэта заключаецца ў як найлепшай падрыхтоўцы моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. З днём 1 верасня 2014 г. (а частка законаў ужо з 01.09.2013) уступіла ў сілу распараджэнне міністра адукацыі, якое м.інш. уводзіць змены ў вышэйзгаданым экзамене. Такім чынам, пачынаючы з 2015 года, каб здаць матуру, трэба (як і дагэтуль) набраць мінімум 30 працэнтаў пунктаў па ўсіх абавязковых вусных і пісьмовых экзаменах (здаюць іх на падставовым узроўні) ды, што новае, прыступіць прынамсі да аднаго экзамену на пашыраным узроўні, без г.зв. „парога здавальнасці". Значыцца, вынік не ў кожным выпадку такі істотны, а самае галоўнае — прыступіць.

Найбольшыя змены ў спосабе здавання экзаменаў чакаюць матурыстаў на польскай мове ды мовах нацыянальных меншасцяў, значыцца — таксама беларускай. У вуснай частцы знікаюць г.зв. прэзентацыі, якія заключаліся ў выказванні вучня на раней выбраную і падрыхтаваную тэму. Неафіцыйна гаварылася пра масавы гандаль такімі працамі ў сеціве. Цяпер гэта будзе адбывалацца „з маршу" — матурыст (напоўнены ведамі і ўмеласцямі за час некалькігадовай вучобы) увойдзе ў экзаменацыйную залу, выбярэ (у выніку жараб'ёўкі) тэму выказвання разам з тэкстам па культуры, падрыхтуецца, а затым выкажацца перад камісіяй, якая потым правядзе з ім размову. У пісьмовай частцы экзамену будуць ацэньвацца ўмеласці вучня, а таксама ход яго разважанняў. Дазваляецца, больш чым раней, на ўласную, суб'ектыўную інтэрпрэтацыю літаратурных твораў, толькі трэба яе добра абгрунтаваць. Нагадаю, што дагэтуль была адпаведная мадэль адказаў, у якую трэба было «трапіць» вучню.

Побач з тымі трапнымі і патрэбнымі зменамі ёсць таксама такія, якія выкліка-



Ян КАРЧЭЎСКІ

юць пэўныя сумненні. Гэта м. інш. абавязковае прыступленне да аднаго экзамену на пашыраным узроўні. Менавіта — прысутнасць, а не вынік. Маўляў, прыйшоў, падпісаў спісак ды пайшоў. І якія тут выхаваўчыя мэты?

Асобы адказныя за нацмены як у Акруговай экзаменацыйнай камісіі ў Ломжы, так і ў Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі ў Варшаве ўжо пад канец 2012 года правялі чатыры семінары з удзелам настаўнікаў, экзаменатараў, аўтараў і рэцэнзентаў матуральных заданняў сярод беларускай, украінскай, літоўскай нацыянальных меншасцяў ды кашубскай этнічнай групы. У час сустрэч усе сабраныя знаёміліся з новымі законамі, дакументамі, выконвалі шматлікія практыкаванні, распрацоўвалі задачы ў новы інфарматар. Працавалі сумесна ды ў групах з паасобных нацыянальнасцяў. Усе заняткі прафесіянальна вялі прадстаўнікі вышэйзгаданых інстытуцыяў: Люцына Грабоўская — тадышні кіраўнік Матуральнай групы ЦЭК, Паўліна Аляхоўская — адказная за мовы нацыянальных меншасцяў у ЦЭК, Альжбета Калісцяк — каардынатар матуральнага экзамену з АЭК у Ломжы.

Дзякуючы гэтым курсам, настаўнікі-беларусісты ў ліцэях ў Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім ведалі як працаваць ужо з першакласнікамі, каб як найлепш падрыхтаваць іх да новай матуры ў 2015 годзе.

Ян КАРЧЭЎСКІ

ЯК НАПІСАЦЬ МАТУРУ?

На матуральным пісьмовым экзамене па беларускай мове з 2015 года на падставовым узроўні ў вучняў паяўляцца да выбару два тыпы заданняў. Вырашэнне кожнага з іх патрабуе ўмеласці напісання аргументацыйнага тэксту — сачынення або інтэрпрэтацыі паэтычнага тэксту. Цяжка на сённяшні дзень знайсці гатовы рэцэпт на напісанне добрай працы. Вядома, што канчатковы поспех залежыць ад ведаў, умеласцяў, кемлівасці ды творчага падыходу самога матурыста. Тым не менш, ніжэйпададзеныя ўказанні могуць быць прыдатныя, галоўным чынам тым, якіх чакае экзамен на атэстат сталасці па беларускай мове.

1. Матуральнае сачыненне (rozprawka)

Сачыненне — гэта вуснае выказванне, у якім мы разглядаем нейкую важную праблему. Найчасцей стараемся штосьці даказаць, да нечага пераканаць, адказаць на пастаўленае пытанне, развеяць сумненне. Сачыненне вымагае ад аўтара, каб выявіў ён адназначна свой пункт погляду ў адносінах да тэмы. Сваю пазіцыю трэба добра абгрунтаваць, паслугоўваючыся лагічнымі аргументамі.

Пабудова сачынення

Уступ, які выпаўняе некалькі заданняў:
- уводзіць чытача ў праблематыку, якой будзе датычыць развіццё,
- заахвочвае чытача да прачытання цэлага сачынення,
- прадстаўляе погляд аўтара ў адносінах да праблемы, пададзенай у тэме.

Развіццё — гэта галоўная частка сачынення. Тут заключаецца галоўная частка разважанняў — аргументацыя, якая складаецца з паасобных аргументаў, г.зн. доказаў у абарону нашага пункту гледжання. Аргументы павінны пераконваць.

Заканчэнне, якое спраўна падсумоўвае прадстаўленыя ў сачыненні разважанні.

Прыклады слоў і словазлучэнняў, якімі карыстаемся ў сачыненні

Пачатак выказвання

— Звяртаючыся да тэмы ...
— Мой адказ на пытанне такі ...
— Я не сумняваюся, што ...
— Паводле мяне ...
— Я поўнасцю згодны з поглядам, што ...
— Па-мойму ...

Увядзенне аргументаў

— Па-першае ..., па-другое ..., па трэцяе ...
— Чарговай справай, якую я хачу кранунць ...
— Маім чарговым аргументам ёсць тое, што ...
— Трэба таксама памятаць аб ...
— Я хачу таксама звярнуць увагу на ...
— Трэба адзначыць, што ...

Заканчэнне

— Думаю, што ...
— Паводле мяне, ...
— Як вынікае з прыведзеных аргументаў, ...
— Падсумоўваючы, ...

2. Інтэрпрэтацыя паэтычнага тэксту

План, паводле якога можна зрабіць інтэрпрэтацыю паэтычнага твора

Хто гаворыць?
- Лірычны герой ці наратар. Кім ёсць лірычны герой?
- Акрэслі яго ўзрост, пол, адукацыю, вопыт, веды аб свеце, погляды.
- Якія ён мае погляды на рэчаіснасць і справы, якія кранае?

Да каго гаворыць?
- Да аднаго адрасата ці да групы?
- Да кагосьці, каму трэба штосьці прадставіць, чамусьці яго навучыць а можа пазнаёміць яго са сваімі меркаваннямі, пачуццямі?
- А можа патрабаваць ад яго нейкіх дзеянняў?

Аб чым гаворыць?
- Якая тэма выказвання?
- Сям'я, мары, палітычная сітуацыя, сяброўства, мастацтва, грамадская сітуацыя?
- А можа лірычны герой хоча сказаць нешта пра сябе?
- Аб якім свеце расказвае?
- Фантастычным, рэальным, казачным, гратэскавым?
- Кім ёсць героі яго выказвання і якія між імі суадносіны?
- У якім свеце яны жывуць?
- Як праходзяць здарэнні, у якіх яны ўдзельнічаюць?

У якой ён сітуацыі?
- Што схіляе лірычнага героя да выказвання?
- Настрой?
- Палітычная, грамадская сітуацыя, уласныя роздумы ці перажыванні?

Якой мовай гаворыць і якая форма яго выказвання?
- Мовай простай ці багатай на мастацкія сродкі?
- Ці ўжывае архаізмаў, неалагізмаў, дыялектаў, навуковых тэрмінаў?
- Калі так, то з якой мэтай?
- Якая кампазіцыя (звярні ўвагу на загаловак, рэфрэн, жанр)?
- Якім стылем і сінтаксісам карыстаецца лірычнае «я»?

Апрацаваў
Ян КАРЧЭЎСКІ

МАТУРАЛЬНАЕ САЧЫНЕННЕ (ROZPRAWKA)



Яўгенія ТАРАНТА

ТЭЗІС

1. Калі згаджаемся з пунктам погляду прадстаўленым у тэме працы:

— Я поўнасцю згаджаюся з тэзісам сфармуляваным (пастаўленым) у тэме...
— Я буду бараніць тэзіса, што...
— Я многа (шмат) разоў пераканаўся (пераканалася), што ... слушнае (сапраўднае, праўдзівае)

2. Калі не згаджаемся з поглядам прыведзеным у тэме працы:

— Агульнавядома, што ... аднак я не згаджаюся з гэтым поглядам (у мяне іншы погляд, меркаванне, думкі)
— Я не магу згадзіцца з думкай (поглядам), што...
— Я не магу згадзіцца з тэзісам, які знаходзіцца ў тэме...
— У мяне намер (я намерваюся) палемізаваць з тэзісам, які знаходзіцца ў тэме...
— Нельга згадзіцца з поглядам, што ...
— Нягледзячы на тое, што думаюць іншыя, я асуджаю такі пункт погляду (гледжання), таму што ...

3. Калі ставім уласны змадыфікаваны тэзіс:

— Мой тэзіс гучыць ...
— Я лічу, што ...
— Мой погляд такі, што ...

4. Калі тэма выступае ў форме пытання, можам напр.:

— Я адказваю сцвярджальна на пытанне пастаўленае (якое выступае) ў тэме.
— На пытанне, якое выступае (пастаўленае) ў тэме я вымушаны (вымушаная) адказаць адмоўна.

5. Калі апрача тэзіса ва ўступе памяшчаем агульныя разважанні на тэму звязаную з гэтым тэзісам, карыснымі будуць словазлучэнні:

— Мэтай маіх разважанняў ёсць ...
— Можа варта (трэба) спачатку задумацца над значэннем слова ...
— Я прапаную спачатку паразважаць, чым ёсць ...
— Я хачу засяродзіцца на ...
— Праблема, пра якую хачу пісаць ...

У час збірання аргументаў можам паслугоўвацца фармулёўкамі:

— Мне здаецца, што ..., У мяне няма сумненняў, што ...
— Я ўпэўнены (ўпэўненая), што ...
— Я перакананы (перакананая), што ...
— Нельга не згадзіцца, што ...
— Нельга забываць таксама, што ...
— Трэба прывесці яшчэ адзін аргумент ...
— Гэта чарговы аргумент ...
— Дадатковым (дабавачным) аргументам можа быць ...
— Як прыклад выкарыстаю ...

Увядзенне чарговых аргументаў:

— Па-першае ..., па-другое ..., па-трэцяе ...
— Я пачну свае разважанні ад наймацнейшага (найважнейшага) аргумента...
— Чарговым аргументам ёсць ...
— Нельга абмінуць яшчэ аднаго аргумента ...
— На пацвярджэнне гэтага тэзіса (каб пацвердзіць гэты тэзіс) я магу прывесці наступныя прыклады (доказы) ...
— Але гэта не ўсё. Ёсць яшчэ адзін доказ на гэта, што я маю рацыю ...
— Мае разважанні не былі б поўны-

мі, калі б я не прывёў (прывяла) яшчэ аднаго аргумента ...
- Я звярну ўвагу на яшчэ адзін вельмі істотны (важны) факт ...
- Я хацеў бы (хацела б) спачатку прадставіць ...
- Цяпер перайду (буду) ...

У заканчэнні працы патрэбнымі будуць фармулёўкі:

- На падставе прыведзеных аргументаў ...
- На падставе таго, што я напісаў (напісала) можна сцвердзіць, што ...
- Як вынікае з прыведзеных аргументаў ...
- Я думаю, што я даказаў (даказала), што ...
- Я думаю, што прыведзеныя прыклады пераконваюць, што маё сцвярджэнне (мой тэзіс) слушнае ...
- Хіба я пераканаў (пераканала), што ...
- Усе прыведзеныя мною аргументы пацвярджаюць ...
- Падсумоўваючы мае разважанні хачу сцвердзіць ...
- Думаю, што прыведзеныя аргументы дазволяць поўнасцю згадзіцца са сцвярджэннем памешчаным у тэме.
- На заканчэнне, вяртаючыся да пытання пастаўленага ў тэме, адназначна адказваю: „так".

Набор універсальных фармулёвак, якія можам выкарыстаць у кожнай працы гэтага віду:

- Я іншай думкі, чым мае сябры, таму што лічу, што ...
- Я, нягледзячы на ўсё, не падтрымоўваю паводзін гэтага чалавека (героя).
- Я згаджаюся з усеагульным перакананнем, што ...
- Я выкарыстаю прыклад, які добра адлюстроўвае мой погляд.
- Цяжка адназначна акрэсліць, чыя ў гэтай спрэчцы праўда, але я прыхільнік погляду ...
- Я дакажу гэты тэзіс у наступны спосаб ...

Важнай рэччу ёсць выкарыстанне трапных цытатаў. Можам іх увесці між іншым у наступны спосаб:

- Каб пацвердзіць гэты тэзіс я прывяду словы вядомага філосафа „..............."
- Мае думкі найлепш пацвердзяць словы „............"
- Я адклікнуся да слоў „.............."
- Пра гэта сведчаць словы „.............."
- Вось, што на гэту тэму гаворыць .... „..........................."
- Каб падтрымаць мае думкі, я прывяду словы: „.............................."
- Рацыю мае ...., гаворачы (выказваючы наступныя словы): „................"
- Найбольш адлюстроўваюць гэта словы: „..........................."

Яўгенія ТАРАНТА

СЦЭНАРЫІ ЎРОКАЎ



Анна КАЛІНОЎСКАЯ

Тэма: Я І МАЯ СЯМ'Я.

АПЕРАТЫЎНЫЯ МЭТЫ:

Вучань:
- — разумее гутарку настаўніка,
- — узбагачае свой слоўнікавы запас,
- — разумее прачытаны тэкст,
- — выкарыстоўвае вывучаныя словы ў простых сказах,
- — правільна падбірае словы,
- — разумее неабходнасць клапаціцца пра сяброўскія адносіны ў сям'і.

МЕТАДЫ ПРАЦЫ: размова, інтэрв'ю, практычная работа, мазгавы штурм.

ФОРМЫ ПРАЦЫ: індывідуальная, калектыўная.

НАВУЧАЛЬНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ: тэкст аповеду пз. „Сям'я", карткі з загадкамі, Польска-беларускі слоўнік.

ХОД УРОКА:

1. Арганізацыйны момант.

2. Праверка хатняй працы. Вучань прыпамінае, што ведае на тэму прыметніка.

3. Уступная гутарка. Настаўніца: Сёння на ўроку будзем займацца вельмі важнай справай, якая займае асаблівае месца ў жыцці кожнага чалавека. А пра што я гавару, вы самі павінны дадумацца пасля выслухання кароценькага тэксту.

4. Настаўнік раздае вучням карткі з тэкстам без загалоўка, а пасля чытае яго ўголас. У нас вялікая і **дружная сям'я**. Найстарэйшы ў нашай сям'і — дзядуля Андрэй. Ён пенсіянер, а раней быў слесарам. Бабуля Мар'я маладзейшая за дзядулю на два гады. Яна ўсё жыццё працавала краўчыхай, а цяпер таксама на заслужаным адпачынку. Мой бацька наймаладзейшы з трох сыноў дзядулі і бабулі. Яго завуць Міхась. Ён інжынер, а мая мама Галіна — лекар. Мой старэйшы брат Сяргей — студэнт, я Саша, школьнік, а нашы наймяншыя, блізняты Надзя і Таня, — дашкольнікі. Сяргей — цудоўны спартсмен, **ён не толькі мой брат, але і найлепшы, найбліжэйшы сябар.**

Працуем і вучымся мы ў розныя змены і толькі вечарамі **збіраемся разам**. Пачынаецца **няспешная, сардэчная гутарка**, успаміны пра дзяцінства, аповеды пра нашых сваякоў.

Далей настаўнік паясняе незразумелыя словы.

5. Дайце загаловак да гэтага тэксту — напр. Сям'я

6. Сённяшняя тэма гучыць *Я і мая сям'я* — запісанне даты і тэмы на дошцы.

7. Вышукайце ў тэксце і падкрэсліце ўсе назвы членаў сям'і, а пасля запішам іх на дошцы. Вучань: Члены сям'і: дзядуля, бабуля, бацька, маці, брат, блізняты.

8. На вашу думку, каго тут не хапае? Каго яшчэ можам дапісаць? Вучань: Сястра, цётка, дзядзька, прадзед, прабабка, айчым, мачыха — дапісваем. Хто не ведае нейкага слова — правярае яго ў слоўніку.

9. Цяпер раскажыце пра сваю сям'ю.
- — Колькі чалавек налічвае твая сям'я?
- — Дзе вы жывяцё?
- — Ёсць у цябе брат ці сястра?
- — Як іх завуць?
- — Дзе жывуць твае бабулі і дзядулі? Адкуль яны?
- — Ты іх часта наведваеш?
- — Хто ў вашай сям'і найстарэйшы, а хто наймаладзейшы?

10. Цяпер гляньце на тэкст і прачытайце падкрэсленыя мною словы і словазлучэнні. Аб чым яны сведчаць? Якія адносіны павінны быць у сям'і?

11. Вучні цягнуць картачкі з загадкамі, чытаюць ўголас і адказваюць на пытанне.

Хто гэта?
Брат маёй мамы — дзядзька
Жонка майго бацькі — мама
Жонка майго дзеда — бабулька
Бацька майго бацькі — дзед
Ігд.

12. Хатняя праца: Намалюйце сваю сям'ю і навучыцеся расказваць пра яе.

Апрацавала
Анна КАЛІНОЎСКАЯ

КЛАС II ЛІЦЭЯ

Сцэнарыі ўрокаў

Тэма: ВЕРБНІЦА — ВЕРАВАННІ, АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ.

МЭТЫ ЎРОКА

Вучань:
- ведае, адкуль бярэ сваю назву свята;
- ведае звычаі, абрады, старажытныя вераванні, звязаныя са святам;
- азнаёміцца з новай лексікай;
- разумее прачытаны тэкст;
- адказвае на пытанні да тэксту;
- знаходзіць у тлумачальным слоўніку паняцці па тэме.

МЕТАДЫ ПРАЦЫ Ў КЛАСЕ: праца з тэкстам, гутарка;

ФОРМЫ ПРАЦЫ: самастойная праца вучняў;

НАВУЧАЛЬНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ: Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, карткі з тэкстам.

ХОД УРОКА:

1. Уступная гутарка на тэму „Вербніцы" Сёння на ўроку пастараемся даведацца нешта пра свята, якое заканчвае Вялікі пост і папярэджвае Вялікдзень, а менавіта пра Вербніцу, яе вытокі і абрады. У старажытнасці „Вялікі дзень" быў сустрэчай Новага года па сонечным календары і святкаваўся ў дзень веснавога раўнадзенства. Але з пашырэннем хрысціянства прыстасаваны быў да Пасхі і стаў перасоўным святам.
Апошняя нядзеля перад Вялікаднем называецца Вербніцай або Пальмовай нядзеляю. У гэты дзень усходнія славяне, а ў тым ліку і беларусы, у царкве асвячалі галінкі вярбы.
Напэўна ведаеце, у гонар якога здарэння, хрысціяне асвячаюць пальмы ці галінкі вярбы. Хто ведае? (рабілі гэта ў памяць уезду Ісуса Хрыста ў Ерусалім)
А чаму менавіта галінкі вярбы і з якой мэтай іх выкарыстоўвалі на працягу года, даведаемся на сённяшнім уроку.

2. Запісанне тэмы на дошцы Вербніца — вераванні, абрады, звычаі.

3. Паясненне слоў - вучні шукаюць у тлумачальных слоўніках і голасна чытаюць.
Абрад — комплекс пэўных дзеянняў,

з дапамогай якіх магічным шляхам можна дабіцца жаданага выніку, у якіх адлюстроўваюцца бытавыя ці культавыя звычаі народа. Абрады звязаныя ў асноўным з гаспадарчым дабрабытам і асабістым лёсам чалавека; напр.: вясенні абрад, жніўны абрад, вясельныя абрады.
Звычай - агульнапрыняты, здаўна заведзены парадак у грамадскіх паводзінах; напр. старадаўні звычай.

Вераванне - перакананне ў тым, што нешта існуе сапраўды, тое, у што верыць чалавек.

4. Раздача картак з тэкстам і пытаннямі.

Вербніца
Вербніца — дзень, які хрысціянская царква ўшаноўвае вялікім святам, якое адзначаецца ў апошнюю перадвелікодную нядзелю.
Гістарычныя карані Вербніцы сягаюць у дахрысціянскія часы. Асноўным абрадам святочнага дня стала асвячэнне галінак вярбы, якім потым прыпісваліся шматлікія магічна-аздараўленчыя ўласцівасці. Такі звычай вядомы яшчэ са старажытных часоў у многіх народаў. Асноўны яго сэнс — дрэва, якое раней за іншыя адгукваецца на прабуджэнне зямлі, павінна перадаць сваю моц, здароўе, прыгажосць чалавеку і жывёлам. Таму асвечанымі ў царкве галінкамі вярбы сцябалі ўсіх дамашнікаў, а перш за ўсё дзетак, і прыгаворвалі:

„Вярба б’е, не я б’ю,
за тыдзень Вялікдзень,
будзь здароў, не ўмірай,
Вялікадня дачакай,
Ужо недалечка чырвона яечка.
Будзь здаровы, як вада!
Вудзь багаты, як зямля!”
Або:
„Не я б’ю, вярба б’е,
За тыдзень — Вялікдзень
Хвароба ў лес на верас,
А здароўе ў косці!
Не я б’ю, вярба б’е,
За тыдзень — Вялікдзкень,
Будзь здароў, як вада,
А расці, як вярба!
Будзь здароў на ўвесь год!”

Асвечаным галінкам вярбы ўвесь год надавалася магічнае значэнне, таму адну частку асвячоных галінак клалі за ікону, утыкалі ў сцены, а з другой праводзілі цэлы шэраг ахоўна-магічных дзеянняў. Напрыклад, каб абараніцца ад маланкі, усе члены сям’і з’ядалі па аднаму пухірку асвечанай вярбы.
Нашы продкі верылі, што асвячоная вярба дапамагала засцерагчы жывёлу ад ведзьмаў, ад благога вока суседзяў, ці іншых аднавяскоўцаў, спрыяла добрай малочнасці. У сувязі з гэтым гаспадар абыходзіў з галінкамі вярбы ўсе будынкі, дзе стаяла розная жывёла, і тройчы сцябаў імі кожную жывёліну, а затым утыкаў іх у шчыліны сцяны. Потым гаспадар ішоў у сад і таксама тройчы сцябаў там кожнае пладаноснае дрэва, тое ж самае адбывалася ў агародзе і на ніве. Напрыканцы рытуальнага абыходу гаспадар кіраваўся на могілкі і трохразовым лёгкім хвастаннем вітаў магілы сваіх суродзічаў. Галінкі вярбы, што браліся на ніву і на могілкі, не несліся дадому, а ўтыкаліся ў зямлю на месцы правядзення рытуалу.
Пазней, на працягу ўсяго года, асвячоныя галінкі вярбы неаднаразова ўжываліся ў паўсядзённым сялянскім жыцці ў якасці ахоўнага амулета. У дзень святога Юр’я свянцоная вярба служыць пры выгане жывёлы першы раз на пашу, што павінна захоўваць яе ад ваўкоў і хваробаў, а ў Святаянскую ноч вярбу памяшчаюць над дзвярыма хлява, каб бараніла кароў ад чараўніц.
Вярбы ніколі не выкідвалі, а захоўвалі да наступнай Вербніцы. І толькі пасля таго, як будуць асвечаныя новыя галінкі, старыя спальваліся ў печы.

5. Настаўніца чытае тэкст.

6. Вучні адказваюць на пытанні.

Пыт. І. Ад чаго паходзіць назва веснавога свята — Вербніца? У некалькіх сказах запішы адказ.

Пыт. II. Чаму асвячалі галінкі менавіта вярбы?
Пыт. III. Якія язычніцкія і хрысціянскія элементы выступаюць у абрадах, звязаных са святам Вербніцы?

7. Хатняя праца. Настаўніца паясняе.
Яшчэ ў старажытнасці людзі хацелі паўплываць на прыродныя сілы, на свой лёс, таму выконваючы шматлікія абрады мелі на ўвазе тры галоўныя мэты:

А. Запэўніць здароўе і сілу сям'і, а што за гэтым ідзе, паўплываць на працяг роду.
Б. Запэўніць добры, багаты плён, здароўе жывёлы.
В. Ушанаваць памяць продкаў.

Вышукайце ў тэксце пацвярджэнне гэтых слоў і запішыце.

8. Падсумаванне — гутарка на тэму — што запамяталі з урока ?

Апрацавала
Анна КАЛІНОЎСКАЯ

КЛАС II ЛІЦЭЯ

Сцэнарыі ўрокаў

Тэма: ПРЫРОДА, АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА „НОВАЯ ЗЯМЛЯ".

МЭТЫ ЎРОКА:

Вучань патрапіць:
— знайсці патрэбны фрагмент тэкста,
— адказаць на пытанні да тэкста,
— вылічыць звычаі і абрады, апісаныя ва ўрыўках паэмы,
— прыкмеціць, якую функцыю маюць апісанні прыроды,
— карыстацца тлумачальным слоўнікам.

ФОРМЫ ПРАЦЫ: праца ў групах / парах

МЕТАДЫ ПРАЦЫ: праца з мастацкім тэкстам, з тлумачальнымі слоўнікамі,

НАВУЧАЛЬНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ: карты з пытаннямі для кожнай групы, карты працы для кожнага вучня з усімі пытаннямі, тлумачальны слоўнік беларускай мовы

ЛІТАРАТУРА: „Новая Зямля" Якуба Коласа

ХОД УРОКА:

1. Арганізацыйны момант — прысутнасць, раздача кніжак і слоўнікаў.

2. Уступная гутарка:
— прыгаданне тэмы апошняга ўрока; На апошнім уроку мы займаліся тэмай абраднасці звязанай з Вербніцай.
— уводзіны ў сённяшнюю тэму -

Знаходзімся ў перыядзе Велікоднага тыдня і адначасова знаходзімся на этапе пазнавання беларускай эпапеі — „Новай зямлі". „Новая зямля" з'яўляецца энцыклапедыяй сялянскага жыцця канца XIX стагоддзя. Там шырока і падрабязна апісаныя будні і святы сям'і лесніка Міхала. Адтуль можам шмат даведацца пра звычаі і абрады звязаныя з Вялікаднем, Калядамі, сенакосамі, жнівом ігд. Даволі важнае месца ў паэме адыгрываюць таксама апісанні прыроды. Менаваіта таму, на аснове гэтай паэмы сёння разгледзім звычаі

і абрады, якія датычацца Вялікадня. **Мэта сённяшняга ўрока**, гэта знаёмства са спосабам прадстаўення прыроды, звычаяў і абрадаў у „Новай зямлі" на аснове раздзела пз. „Вялікдзень".

3. Запісанне тэмы на дошцы і ў сшытках.

Прырода, абрады, звычаі ў паэме Якуба Коласа „Новая зямля".

4. Падзяліцеся на групы па 2-3 асобы. Кожная група мае асобнае заданне. На картачках маеце запісаныя пытанні, на якія знойдзеце адказы ў тэксце. Тлумачальныя слоўнікі выкарыстайце дзеля паяснення невядомых слоў.
Выбярыце сабе картачкі з пытаннямі. Кожнае пытанне мае нумар. Паводле нумараў будзеце выступаць і ў такі спосаб складзем нататку.
Прачытайце пытанні, ці разумееце іх? (паясненне). Маеце 4 хвіліны на тое, каб падрыхтавацца і пасля кожная група мае 2 хвіліны на тое, каб прадставіць тое, што падрыхтавалі і запісанне гэтага на дошцы або падыктаванне іншым вучням.

Пытанні:

1. Як у хаце лясніка Міхала да свята рыхтаваліся дзеці? (Яны добраахвотна раніцай падмялі панадворак, панасыпалі пясочку на сцежкі, каб каля хаты было прыгажэй).
2. Як у доме Міхала да свята рыхтаваліся мужчыны? (Міхал і Антось пабрыліся і памыліся цёплаю вадою і сабіраліся ў царкву спавядацца. Антось памазаў дзёгцем каламажку, каб не скрыпела, выпрабаваў яе. Міхал выязджаючы з хаты пакланіўся ўсім дамашнім і папрасіў у іх прабачэння за грахі).
3. Як у гэтым раздзеле апісваецца прырода вечарам? Якімі рысамі яна надзелена? (Выступае персаніфікацыя прыроды, яна спакойная, лагодная, быццам нешта разважае, усё маўчыць, жыве згодна з людзьмі, быццам адчувае паважнасць свята, чакае Вялікадня і цешыцца на свята).
4. Як святочны час дзейнічае на злых людзей, а таксама на звяроў? (Звяры і птушкі чуюць Вялікдзень, а дрэнныя людзі падабрэлі і адзін аднаго не пасмее пакрыўдзіць, бо ўсе адчуваюць пашану да свята).
5. Якога старога звычаю прытрымліваліся сталыя мужчыны? (Сталыя мужчыны ў хаце адпраўлялі свае літаніі — спявалі пра пакуты Езуса, — седзячы згодна і спявалі набожныя песні з кантычкі, былі клопаты з трапленнем у тон і з-за таго выводзіліся невялікія спрэчкі).
6. Да каго заехалі Антось з Міхалам перад набажэнствам? Як святкаваў Карусь Дзівак? (Антось з Міхалам заехалі да швагра, які ў кажусе ляжаў на печы і курыў люльку, з усімі жартаваў і спрачаўся з жонкай Магдай).
7. Што адбывалася ў царкве? (У царкве было поўна народу, пасярод стаяла плашчаніца прыбраная зялёнымі ёлкамі, да яе падыходзілі жанчыны і дзеўкі ў чырвоных або белых хустках і білі паклоны, направа стаялі мужчыны, Чыліноў Алесь чытаў „святыя дзеянні", званы абвяшчалі „Хрыстос Васкрос"; пад канец усе ставілі свае „велікодныя дары" на цвінтары і поп іх свяціў.
8. Да чаго параўноўвае аўтар маляшчыся народ? (Аўтар параўноўвае народ да вады:
   „Народ калышацца, хвалюе,
   Бы ў цёмным віры вада тая,
   І ўсё плыве, ўсё прыбывае...";
   і да нівы:
   „Народ увесь, бы ў полі ніва
   Буйнымі гнецца каласамі,
   Скланіўся ціха галавамі."
9. Што адбывалася пасля набажэнства? (Людзі забіралі кошыкі з „свянцоным", віншавалі другіх са святам, і спяшаліся дамоў, каб наесціся пасля посту)
10. Як выглядала прырода святочнай раніцай? (Прырода быццам таксама святкавала, усё выглядала прыгожа, святочна, ад усходу сонца чырванеюць курганы і падаюць праменні на

ўзгоркі, хмаркі быццам у каштоўных тканінах — шаўках, аксамітах, то плывуць, то спыняюцца і шчасліва ўсміхаюцца, прырода вітала свята; гэта апісанне ўсходу сонца ў „святы вялікаднік").

11. Як святкавалі ў доме Міхала? (Дзеці вітаюць Міхала і Антося, якія прыйшоўшы ў хату з усімі вітаюцца, цалуюцца і ўсіх віншуюць, пасля памыліся і садзяцца за стол, каб разгаўляцца, усе ветліва адносяцца да другіх, снеданне пачынаюць спяваннем набожнай песні , пасля маці прыносіць з каморы бутэльку гарэлкі і пачынаюць снеданне,
„Са смакам елі і багата
- На тое ж даў бог людзям свята.".
12. Якія словы-пажаданні гаворыць гаспадар падымаючы першы тост? (Гаспадар жадае:
„Дай, божа за год дачакаць
Здаровым, вясёлым, жывым
І новы вялікдзень таксама спаткаць
У добрым здаровейку ўсім,
Каб гора і смутку не зналі.")
13. Як выглядаў святочны стол, што падрыхтавала гаспадыня? (Стол быў накрыты белым абрусам, на стале ляжалі розныя прысмакі — шынка, як кадушка, кілбасы, як падковы, „між сцёган, сала і грудзінак красуе ўсмажаны падсвінак...", апрача таго муштарда і хрэн, пірагі і бабкі).
14. Раздача кожнаму вучню картак з пытаннямі кожнай групы.
15. Групы прадстаўляюць падрыхтаваныя адказы на дошцы або вусна і ўсе запісваюць іх у сшыткі.
16. Паясненне хатняй работы — вучні маюць гэтае пытанне на раздадзеных раней картках.

Хатняя работа.

Як думаеце, чаму ў „Новай зямлі" тэма прыроды спалучаецца з тэмай абраднасці? Адкажыце ў 2-5 сказах.(бо была яе неад'емнай часткай, прырода спадарожнічала чалавеку і быццам бы адчувала яго настрой, пачуцці)

Апрацавала
Анна КАЛІНОЎСКАЯ

КЛАС І ЛІЦЭЯ **Сцэнарыі ўрокаў**

Тэма: ЗАНЯТКІ І ВЕРАВАННІ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН ДА ПРЫНЯЦЦЯ ХРЫСЦІЯНСТВА.

МЭТЫ ЎРОКА:

Вучань патрапіць:
— пералічыць заняткі і вераванні ўсходніх славян, апісаных у тэксце;
— апісаць асаблівасці вонкавага выгляду старажытных беларусаў;
— растлумачыць значэнне слоў — бондарства, ганчарства, ткацтва, кушнерства, кавальства;
— пералічыць імёны язычніцкіх багоў;
— адказаць на пытанні да тэкста;
— карыстацца тлумачальным слоўнікам.

ФОРМЫ ПРАЦЫ: праца ў групах;

МЕТАДЫ ПРАЦЫ: праца з тэкстам — выбар інфармацыі;

НАВУЧАЛЬНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ: Падручнік да І класа ліцэя „Родная літаратура" аўтарства Вольгі Сянкевіч, старонка 127; Тлумачальны слоўнік беларускай мовы.

ХОД УРОКА

1. **Арганізацыйны момант** — прывітанне, прысутнасць.

2. **Уступная гутарка:** — прыгаданне тэмы апошняга ўрока, *На апошнім уроку мы чыталі народнае паданне, з якога вы даведаліся пра некаторыя звычаі звязаныя з язычніцкім святам — Купаллем*. — уводзіны ў сённяшнюю тэму. *Мэта сённяшняга ўрока* — гэта пазнанне заняткаў і вераванняў усходніх славян да прыняцця хрысціянства.

3. **Запісанне даты і тэмы на дошцы і ў сшытках.** *Заняткі і вераванні ўсходніх славян да прыняцця хрысціянства.*

4. **Падзел вучняў на 7 групаў і раздача картак з пытаннямі, на якія адказы трэба будзе знайсці ў тэксце.** Кожнае пытанне мае нумар. Паводле нумараў лідары групаў будуць выступаць з адказамі.

5. **Прачытайце пытанні, ці разумееце іх?** *(паясненне).*

6. **Пытанні:**

6.1 Апішы знешні выгляд продкаў беларусаў. (Народ моцны, рослы, са светла-русымі валасамі і сіня-шэрымі вачамі, адзенне белага колеру, льняныя, тканыя кашулі)

6.2 Чым займаліся ўсходнія славяне ў старадаўнія часы? (Займаліся земляробствам, рыбалоўствам, пчалярствам, разводзілі хатнюю жывёлу, палявалі на дзікіх звяроў)

6.3 Якімі рамёствамі займаліся ўсходнія славяне?
(Бондарства, ганчарства, ткацтва, кушнерства, кавальства)

6.4 Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам коратка паясні паняцці „бондарства", „ганчарства",
(бондарства — выраблянне бочак, дзежак;
ганчарства — выраблянне з гліны посуду і іншых рэчаў)

6.5 Выпішыце назвы святаў, якія адпраўляліся ў гонар бога сонца.
У якія поры года іх святкавалі і чаму менавіта тады?
(зімою, канец снежня — Каляды — ад гэтага часу сонца падымалася вышэй, мацней грэла;
вясною — Вялікдзень — сонца перамагала зіму, дзень рабіўся большы за ноч; летам — Купалле — у гонар летняга бога сонца)

6.6 Назаві імёны паганскіх багоў, аб якіх успамінаецца ў тэксце, каротенька іх апішы.
(Ярыла — бог сонца і ўрадлівасці, што ўяўляўся маладым малайцом на белым кані і ў белай вопратцы;
Пярун — бог грому і маланкі;
Род — галоўны бог неба;
Лясун — бог леса, блытаў сцежкі, палохаў людзей;
Вадзянік — бог вады;
Дамавік — сцярог хату.)

6.7 Як славяне адносіліся да памерлых продкаў. Назаві святы ў іх гонар. (Памерлых продкаў шанавалі, як і багоў, кланяліся ім, у іх памяць ладзілі святы — Радаўніца, Дзяды.)

7. **Настаўніца чытае голасна тэкст, а ўсе вучні назіраюць за тэкстам і паясняюць няясныя словы.** *(Заняткі і вераванні ўсходніх славян да прыняцця хрысціянства).*

8. **Падрыхтоўка адказаў на пытанні.**

9. **Групы прадстаўляюць падрыхтаваныя адказы на дошцы або вусна і ўсе запісваюць іх у сшыткі.**

10. Падсумаванне ў форме пытанняў скіраваных да ўсіх вучняў — што запамяталі з урока?

Пытанні — зрабіць ксеракс і разрэзаць.

1. Апішы знешні выгляд продкаў беларусаў.
2. Чым займаліся ўсходнія славяне ў старадаўнія часы?
3. Якімі рамёствамі займаліся ўсходнія славяне?
4. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам коратка паясні паняцці „бондарства”,„ганчарства”.
5. Выпішыце назвы святаў, якія адпраўляліся ў гонар бога сонца. У якія поры года іх святкавалі і чаму менавіта тады?
6. Назаві імёны паганскіх багоў, аб якіх успамінаецца ў тэксце, кароценька іх апішы.
7. Як славяне адносіліся да памерлых продкаў. Назаві святы ў іх гонар.

апрацавала
Анна КАЛІНОЎСКАЯ

ЛІЦЭЙ — І КЛАС

Сцэнарыі ўрокаў

Тэма: I СПРАЖЭННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ. / I KONIUGACJA CZASOWNIKÓW.

МЭТЫ ЎРОКА

Пасля заканчэння ўрока вучань павінен:
- ведаць, што гэта дзеяслоў, на якія пытанні адказвае,
- даць прыклады дзеясловаў І спражэння, знайсці іх у тэксце;
- разумець прынцыпы спражэння дзеясловаў І спражэння;
- правільна спрагаць дзеясловы;

ФОРМЫ ПРАЦЫ: праца ў групах

МЕТАДЫ ПРАЦЫ: Пошук, практычныя заняткі,

ДАПАМОЖНІКІ: каляровыя картачкі з пытаннямі для кожнай групы; напр. белыя карткі з усімі пытаннямі для папаўнення для кожнага вучня.

ХОД УРОКА:

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Уводзіны ў тэму:** Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім (будучым простым) часе абвеснага ладу называецца спражэннем (koniugacją). У залежнасці ад канчаткаў формаў цяперашняга часу ў беларускай мове ўсе дзеясловы падзяляюцца на два спражэнні: першае, другое, і некалькі дзеясловаў, якія залічаюцца да рознаспрагальных.
3. **Пытанне да вучняў:** навошта мы павінны ведаць, як правільна спрагаць дзеясловы? Дзе мы гэтыя веды выкарыстаем? Сёння на ўроку распрацуем першае спражэнне.
4. **Запісанне тэмы на дошцы.** І спражэнне дзеясловаў.
5. **Падзел вучняў на 6 групаў, раздача каляровых картак з заданнямі для кожнай групы і белых картак для папаўнення для кожнага вучня.**

I ГРУПА

На аснове пададзеных канчаткаў праспрагайце дзеясловы ў цяперашнім часе: *чытаць, пісаць, везці, браць* і падкрэсліце канчаткі.

Адзіночны лік
1-я -у/-ю
2-ты -еш/-эш/-аш
3-ён, яна, яно -е/-э/-а

Множны лік
1-мы -ём/-ем/-ом/-ам
2-вы -еце/-яце/-аце
3-яны -уць/-юць

	чытаць	*пісаць*	*везці*	*браць*
Адзін. лік				
1-я				....
2-ты				....
3-ён, яна, яно				....
Мн. лік				
1-мы				....
2-вы				....
3-яны				....

II ГРУПА

Да I спражэння адносяцца аднаскладовыя дзеясловы, якія ў інфінітыве заканчаныя на - іць , напр.: *біць, віць, ліць, мыць, выць, шыць*.

Праспрагайце дзеясловы *шыць, мыць* у цяперашнім часе на аснове пададзеных канчаткаў.

Адзіночны лік
1-я -у/-ю
2-ты -еш/-эш/-аш
3-ён, яна, яно -е/-э/-а

Множны лік
1-мы -ём/-ем/-ом/-ам
2-вы -еце/-яце/-аце
3-яны -уць/-юць

На аснове спражэння дзеяслова *піць* паспрагайце дзеяслоў *біць*.

1. я *п'ю*		1. мы *п'ём*	....
2. ты *п'еш*		2. вы *п'яце*	....
3. ён, яна, яно *п'е*		3. яны *п'юць*	....

III ГРУПА

Секчы, пячы, стрыгчы, берагчы, сыпаць, магчы, вязаць — гэта дзеясловы I спражэння. Выкарыстоўваючы пададзеныя канчаткі ўтварыце формы 1 і 2 асобы адзіночнага ліку і звярніце ўвагу на чаргаванне падкрэсленых зычных.

	секчы	*пячы*	*стрыгчы*	*сыпаць*	*вязаць*
1. я -у/-ю					....
2. ты -еш/ -эш/ -аш					....

На аснове прыкладаў выпішыце, якія літары чаргуюцца ....
....

IV ГРУПА

Да І спражэння залічаем і зваротныя дзеясловы, такія як напр.: *мыцца, грэцца, спяшацца, спыняцца*.

Праспрагайце іх на аснове пададзеных канчаткаў. Памятайце аб правапісе часціцы -цца, -ся.

Адзіночны лік
1-я -у/-ю
2-ты -еш/-эш/-аш
3-ён, яна, яно -е/-э/-а

Множны лік
1-мы -ём/-ем/-ом/-ам
2-вы -еце/-яце/-аце
3-яны -уць/-юць

	мыцца	*грэцца*	*спяшацца*	*спыняцца*
Адзін. лік				
1-я				....
2-ты				....
3-ён, яна, яно				....
Мн. лік				
1-мы				....
2-вы				....
3-яны				....

V ГРУПА

Праспрагай дзеясловы ў будучым простым часе. Выкарыстай дадзеныя канчаткі.

Адзіночны лік
1-я -у/-ю
2-ты -еш/-эш/-аш
3-ён, яна, яно -е/-э/-а

Множны лік
1-мы -ём/-ем/-ом/-ам
2-вы -еце/-яце/-аце
3-яны -уць/-юць

	напісаць	*будаваць*	*сказаць*
Адзін. лік			
1-я			....
2-ты			....
3-ён, яна, яно			....
Мн. лік			
1-мы			....
2-вы			....
3-яны			....

VI ГРУПА

Замяніце дзеясловы будучага простага часу — *напісаць, збудаваць, сказаць* на будучы складаны (зменнае быць + інфінітыў). Пасля замены праспрагайце іх.,

Адзін. Лік

1 я				....
2 ты				....
3 ён, яна, яно				....

Мн. Лік

1 мы				....
2 вы				....
3 яны				....

6. **Падрыхтоўка групаў.**

7. **Выступленні вучняў** — прадстаўнікоў паасобных групаў і прэзентацыя падрыхтаванага матэрыялу на дошцы; адначасова іншыя вучні дапаўняюць задачы на сваіх картах працы.

8. **Падсумаванне ўрока, ацэнка вучняў.**

9. **Заданне і паясненне хатняй працы.**

Хатняе заданне.

У хаце закончыць задачы паасобных групаў і дапоўніць сказы дзеясловамі, што ў дужках у правільнай форме. Памятайце аб правапісе апострафа (‘) і мяккага знака (ь).

1. Ад перапалоху ў грудзях моцна (біць) .... сэрца.
2. Ах, як хочацца піць! Пайду (папіць) .... вадзіцы з калодзежа.
3. Дождж ідзе і не перастае, за акном (ліць) .... як з вядра.

Апрацавала
Анна КАЛІНОЎСКАЯ

БЯГУЧЫЯ СПРАВЫ

Прадметны Конкурс

Кураторыя асветы ў Беластоку 24 сакавіка падвяла вынікі прадметных конкурсаў для вучняў пачатковых школ Падляшскага ваяводства. У гэтым навучальным годзе да конкурсу беларускай мовы прыступіла 114 вучняў. Нагадайма яго мэты, вызначаныя кураторыяй:

- ***a)*** *rozwijanie zainteresowań uczniów i motywowanie szkół do podejmowania różnorodnych działań w zakresie pracy z uczniem zdolnym,*
- ***b)*** *pobudzanie do twórczego myślenia oraz rozwijanie umiejętności stosowania zdobytej wiedzy w praktycznym działaniu,*
- ***c)*** *pogłębianie wiedzy i umiejętności z zakresu wybranego przedmiotu,*
- ***d)*** *promowanie pracy szkół i nauczycieli,*
- ***e)*** *wdrażanie uczniów do samokształcenia i przygotowanie ich do nauki w szkołach wyższego stopnia,*
- ***f)*** *promowanie uczniów szczególnie uzdolnionych.*

Кураторыя вызначае, якія веды і ўменні неабходныя вучням на кожным этапе конкурсу і рыхтуе адпаведныя для гэтага тэсты. Іх аўтара назначае кураторыя. Настаўнікі яго не ведаюць ні перад, ні пасля конкурсу. Сёлета усё было як заўсёды, апрача аднаго новага пункту:

15. *Podlaski Kurator Oświaty zastrzega sobie prawo do ustalenia innego progu procentowego kwalifikującego do stopnia rejonowego, wojewódzkiego oraz uzyskania tytułu laureata w przypadku, jeżeli zastosowany zestaw konkursowy będzie miał:*

a. *niską rozwiązywalność na stopniu*

— szkolnym (kryterium uzyskania 90% punktów spełniło w całym województwie mniej niż 5% liczby wszystkich uczestników stopnia szkolnego tego konkursu) — obniżenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia rejonowego,

— rejonowym lub wojewódzkim (kryterium uzyskania 80% punktów spełniło mniej niż30% liczby wszystkich uczestników danego stopnia tego konkursu) — obniżenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem odpowiednio listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia wojewódzkiego lub listy laureatów,

b. *wysoką rozwiązywalność na stopniu*

— szkolnym (kryterium uzyskania 90% punktów spełniło w całym województwie więcej niż 10% liczby wszystkich uczestników stopnia szkolnego tego konkursu) — podwyższenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia rejonowego,

— rejonowym lub wojewódzkim (kryterium uzyskania 80% punktów spełniło więcej niż 40% liczby wszystkich uczestników danego stopnia tego konkursu) — podwyższenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem odpowiednio listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia wojewódzkiego lub listy laureatów.

Гэты пункт дазволіў куратары падрыхтаваць настаўнікам і вучням, якія вывучаюць беларускую мову непрыемны сюрпрыз. Дарэчы, не першы раз. Пакуль пра гэты год, нагадайма, што адбылося ў навучальных гадах 2012/2013 і 2013/2014. Раённы этап конкурсу беларускай мовы вучні пачатковых школ пісалі ў пачатку студзеня, адразу пасля святочнага перапынку, перад праваслаўнымі Калядамі, калі некаторыя школы нават не працавалі. Аб'яднанне АБ-БА ў мінулым навучальным годзе звярнула на гэта ўвагу куратару. Пра, далікатна кажучы, незручную дату мы інфармавалі таксама прадстаўнікоў Міністэрства нацы-

янальнай адукацыі ды Міністэрства адміністрацыі і лічбавізацыі. Куратар тэрміну конкурсу не памяняў, але напісаў, што куратория на этапе планавання памятала пра шматкультурнасць і шматканфесійнасць нашага ваяводства. Тым не менш, у лісце з 17 кастрычніка 2013 г. куратар піша, што немагчыма памяняць ужо тэрмін конкурсу, бо *„Zmiany mogą skutkować niedotarciem na konkursy uczniów, którzy nie będą już śledzić tej sprawy"*. Дзіўна, бо у рэгуляміне конкурсу маем запіс, што за *„powiadomienie uczniów o miejscu i dokładnym terminie przeprowadzenia konkursu z danego przedmiotu na każdym stopniu, zgodnie z informacją zamieszczoną na stronie internetowej Kuratorium Oświaty w Białymstoku"* адказны дырэктар школы, а не самі вучні. Ведаем, што раней здараліся змены тэрмінаў правядзення конкурсаў. Да гонару куратара трэба сказаць, што ў гэтым навучальным годзе ўлічыў наш пастулат і тэрмін памяняў.

Сёлета праз школьны ўзровень прайшлі і трапілі на раённы этап 44 вучні. Трэба ім было там справіцца з тэстам, за які маглі атрымаць максімум 81 бал. Каб дастацца да ваяводскага (фінальнага) этапу, хапіла 64 балы (80 %). На самую вялікую колькасць балаў (75) тэст напісала двое вучняў з Пачатковай школы № 3 у Гайнаўцы, 74 балы — дзве вучаніцы, 73 — дзве вучаніцы, 72 — адна вучаніца, 71 — чатыры вучаніцы, 70 — трое вучняў, 69 — тры вучаніцы, 68 — двое вучняў, 67 — адна вучаніца, 66 — дзве вучаніцы, 65 — пяць вучаніцаў, 64 — чатыры вучаніцы. Як відаць, 32 асобы былі настолькі добра падрыхтаваныя, што атрымалі права змагацца за званне лаўрэата на найвышэйшым узроўні конкурсу. Яго арганізатары, аднак, вырашылі, што гэта надта многа і з дня на дзень паднялі планку патрабаванняў да 66-і балаў. З-за гэтага дзевяць дзяцей (усе з шостага класа) былі адсеяныя і не змаглі прымаць удзел у фінале.

Гэта **адзіны** конкурс для пачаткоых школ, у якім куратория вырашыла пакарыстацца новымі правіламі. Аб'яднанне АБ-БА зноў вырашыла змагацца за вучняў і напісала ліст куратару. Адказ на яго прыйшоў хутка: *„Porównywanie danych statystycznych dotyczących języka białoruskiego oraz języka angielskiego jest nieuprawnione z powodu znacząco różnej trudności testów już na stopniu szkolnym (w przypadku języka angielskiego do stopnia rejonowego zakwalifikowało się najmniej uczniów — zaledwie ok. 6% uczestników, a z języka białoruskiego najwięcej — ponad 38% startujących, próg nie został zmieniony)"*. Чаму нельга параўноўваць? Чаму гэта сведчыць пра складанасць тэсту? Чаму, калі гэты тэст быў такі „лёгкі", куратория не памяняла яго раней? Яны ж яго зацвердзілі! Ці нехта стандарызуе заказаныя на конкурс тэсты? Памяняць можна было іх перад тым, пакуль вучні іх напісалі. Нельга крыўдзіць тых, дзеля якіх праводзіцца гэты конкурс. Вучні атрымалі свае 80 %. Можна падумаць пра гэтыя вынікі інакш, мо яны сведчаць, што вучні былі добра падрыхтаваныя да конкурсу. Справіліся як трэба і вучні, і настаўнікі. Ведалі, што трэба вывучыць, што трэба ведаць і ўмець. І няма нашай віны ў тым, што *„Zdecydowanie inna jest także populacja w przypadku każdego z tych dwóch konkursów (z języka angielskiego startowało 3235 osób, a z języka białoruskiego — zaledwie 114 osób). Bardziej uzasadnione jest, zatem, porównywanie danych statystycznych z takimi przedmiotami jak język rosyjski lub język niemiecki"*. У навучальным годзе 2012/2013 у пачатковых школах нашага ваяводства беларускую мову вывучала ўсяго 1528 дзяцей. Такая наша „папуляцыя". Колькі дзяцей вывучае ў гэтым годзе родную мову, не ведаем, бо куратория аб гэтым не інфармуе.

Усе настаўнікі беларускай мовы даскакнала ведаюць, што *„...konkursy przedmiotowe nie powinny być jedynym, ani najważniejszym czynnikiem motywującym uczniów do nauki, a nauczycieli — do pracy z nimi"*. Ведаюць таксама, што найбольш *„stymulująco wpływa na jakość pracy szkół"*.

Куратар піша, што *„Zasadniczym powodem pozostawienia konkursu z języka białoruskiego była motywacja do nauki języka ojczystego wśród dzieci i młodzieży mniejszości białoruskiej"*. Аднак сёлетнюю матывацыю, якую падрыхтавала нам Падляшкая асветная куратория, цяжка будзе забыць настаўнікам і вучням.

Podlaski Kurator Oświaty

Podlaski Kurator Oświaty

Rynek Kościuszki 9, 15-950 Białystok; tel. (085) 748-48-48; fax. (085) 748-48-49
e-mail: kuratorium@kuratorium.bialystok.pl, http://www.kuratorium.bialystok.pl

Białystok, 17.. 10. 2013

RE.5563.18.2013

Pani
Barbara Piekarska
Przewodnicząca Stowarzyszenia
na Rzecz Dzieci i Młodzieży
Uczących się Języka Białoruskiego AB-BA
w Białymstoku

ul. Częstochowska 6a/8
15-459 Białystok

W odpowiedzi na Pani pismo w sprawie terminu stopnia rejonowego Wojewódzkiego Konkursu Języka Białoruskiego dla uczniów szkół podstawowych w województwie podlaskim w roku szkolnym 2013/2014 informuję, że duża liczba konkursów realizowanych w naszym województwie powoduje konieczność wykorzystania w terminarzu konkursów każdego dnia, który ustawowo nie jest dniem wolnym od nauki.

Zgodnie z kalendarzem roku szkolnego 2013/2014, uczniowie różnych typów szkół mają określone dni wolne od nauki. Poza tym ustawodawca przewidział możliwość ustalania dodatkowych dni wolnych przez dyrektorów szkół. Odpowiada to potrzebom środowiska lokalnego i specyfice szkoły. W związku z tym, biorąc pod uwagę zasięg Wojewódzkiego Konkursu Języka Białoruskiego, liczbę konkursów, wielokulturowość i wielowyznaniowość województwa podlaskiego, a także uwzględniając kalendarz roku szkolnego oraz terminy sprawdzianu zewnętrznego po klasie VI prowadzonego przez OKE w Łomży, ustalono terminy Wojewódzkich Konkursów Przedmiotowych dla uczniów szkół podstawowych w roku szkolnym 2013/2014.

Odnosząc się do Pani pisma, pragnę podkreślić, że sprawy w nim poruszane są bardzo istotne w różnych działaniach Kuratorium Oświaty w Białymstoku. Wojewódzki Konkurs Języka Białoruskiego jest jednym z mniejszych konkursów. W bieżącym roku szkolnym udział w nim zgłosiło 15 szkół, z których do stopnia szkolnego przystąpi 120 uczniów. Zmiana terminu konkursu w bieżącym roku nie jest możliwa, ponieważ jakakolwiek zmiana w terminarzu wiąże się z koniecznością ustalenia innego terminu pozostałych konkursów. Terminarz został już ogłoszony. Szkoły zapoznały się z nim. Zmiany mogą skutkować niedotarciem na konkursy uczniów, którzy nie będą już śledzić tej sprawy. Mając na uwadze jednak podnoszone przez Panią kwestie zapewniam, że w przyszłym roku szkolnym termin stopnia rejonowego omawianego konkursu ulegnie zmianie.

PODLASKI KURATOR OŚWIATY
mgr Jerzy Kiszkiel

Białystok. 05.02.2015

Podlaski Kurator Oświaty

Jerzy Kiszkiel

Szanowny Panie Kuratorze,

Jako organizacja koordynująca prace nad realizacją założeń *Strategii oświaty mniejszości białoruskiej w Polsce* z dużym zaniepokojeniem przyjęliśmy informację o tym, że został podwyższony próg procentowy kwalifikujący uczestników stopnia rejonowego Wojewódzkiego Konkursu Języka Białoruskiego do stopnia wojewódzkiego.

Konkurs języka białoruskiego jest jedynym organizowanym przez Kuratorium Oświaty w Białymstoku, w którym próg został podniesiony. Uzasadniono to „wysoką rozwiązywalnością zestawu konkursowego – kryterium uzyskania 80% punktów spełniło więcej niż 40% liczby wszystkich uczestników danego stopnia tego konkursu". W konkursie języka białoruskiego uczestniczyły 44 osoby, z czego 31 osób uzyskała wynik powyżej 80%, co stanowi 70% liczby wszystkich uczestników. Kuratorium podwyższyło próg z 64 do 66 punktów (84%, a nie 80% jak w pozostałych konkursach). Wyeliminowało to z kolejnego etapu 9 osób, których poziom wiedzy tylko w stopniu minimalnym odbiegał od wiedzy i umiejętności osób zakwalifikowanych. Podobnego kryterium nie zastosowano w przypadku żadnego innego konkursu np. w Wojewódzkim Konkursie Przedmiotowym Języka Angielskiego, w którym uczestniczyło 194 uczniów do kolejnego etapu zakwalifikowano 145 osób, tj. 75% ogólnej ilości uczniów, w Wojewódzkim Konkursie Przedmiotowym Języka Niemieckiego do etapu wojewódzkiego zakwalifikowało się 52% uczniów.

Strategia rozwoju oświaty mniejszości białoruskiej w Polsce, przyjęta i podpisana w 2014 przez Ministra Edukacji Narodowej, Ministra Administracji I Cyfryzacji zakłada współdziałanie wszystkich organów administracji rządowej i samorządowej mające na celu podniesienie zainteresowania nauką języka białoruskiego. Decyzja podjęta przez Kuratorium Oświaty w Białymstoku jest naszym zdaniem bardzo krzywdząca i nie służy dobru uczniów, a w szerszym kontekście oświacie białoruskiej na Podlasiu.

Mając na celu na dobro uczniów zwracamy się z prośba o weryfikację wyników i przywrócenie 80%-owego progu kwalifikującego do etapu wojewódzkiego.

Z poważaniem,

PRZEWODNICZĄCA
STOWARZYSZENIA **AB-BA**
Katarzyna Pawłowska

АБ'яднанне БАцькоў
STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO «AB-BA»
15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8 • e-mail: ab_ba@poczta.onet.eu
WWW.AB-BA.COM.PL

Podlaski Kurator Oświaty

Rynek Kościuszki 9, 15-950 Białystok; tel. (85) 748-48-48; fax. (85) 748-48-49
e-mail: kuratorium@kuratorium.bialystok.pl, http://www.kuratorium.bialystok.pl

RE.5560.31.2014 Białystok, 06.02.2015 r.

Pani
Katarzyna Pawłowska
Przewodnicząca
Stowarzyszenia AB-BA
ul. Częstochowska 6a lok. 8
15-459 Białystok

Odpowiadając na Pani pismo, które wpłynęło do Kuratorium Oświaty w Białymstoku 6 lutego 2015 r. oraz dotyczy kwalifikowania uczestników do kolejnego stopnia Wojewódzkiego Konkursu Języka Białoruskiego, informuję, że zmiana podwyższenie progu kwalifikującego uczestników do kolejnego stopnia konkursu jest zgodne z *Regulaminem* konkursu (rozdz. V, p. 15b, s. 9):

15. Podlaski Kurator Oświaty zastrzega sobie prawo do ustalenia innego progu procentowego kwalifikującego do stopnia rejonowego, wojewódzkiego oraz uzyskania tytułu laureata w przypadku, jeżeli zastosowany zestaw konkursowy będzie miał:

(...)

b. wysoką rozwiązywalność na stopniu

– szkolnym (kryterium uzyskania 90% punktów spełniło w całym województwie więcej niż 10% liczby wszystkich uczestników stopnia szkolnego tego konkursu) – podwyższenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia rejonowego,

– rejonowym lub wojewódzkim (kryterium uzyskania 80% punktów spełniło więcej niż 40% liczby wszystkich uczestników danego stopnia tego konkursu) – podwyższenie progu kwalifikacyjnego następuje przed ogłoszeniem odpowiednio listy uczniów zakwalifikowanych do stopnia wojewódzkiego lub listy laureatów.

Porównywanie danych statystycznych dotyczących języka białoruskiego oraz języka angielskiego jest nieuprawnione z powodu znacząco różnej trudności testów już na stopniu szkolnym (w przypadku języka angielskiego do stopnia rejonowego zakwalifikowało się najmniej uczniów - zaledwie ok. 6% uczestników, a z języka białoruskiego najwięcej – ponad 38% startujących, próg nie został zmieniony). Zdecydowanie inna jest także populacja w przypadku każdego z tych dwóch konkursów (z języka angielskiego startowało 3235 osób, a z języka białoruskiego – zaledwie 114 osób). Bardziej uzasadnione jest, zatem, porównywanie danych statystycznych z takimi przedmiotami jak język rosyjski lub język niemiecki. W

załączeniu przekazuję zestawienie danych liczbowych dotyczących wszystkich konkursów przeprowadzanych w szkole podstawowej.

Z żadnego innego przedmiotu, oprócz języka białoruskiego, do stopnia wojewódzkiego nie zakwalifikowało się więcej niż 10% startujących (z języka angielskiego stanowią oni tylko ok. 4%). W przypadku języka białoruskiego (nawet po zmianie progu) jest to 20% wszystkich uczestników stopnia szkolnego oraz jednoznacznie wskazuje na preferowanie uczestników tego konkursu. Dodatkowo, liczba uczniów zakwalifikowanych do stopnia wojewódzkiego z języka białoruskiego w szkole podstawowej jest zbliżona do średniej z kilku ostatnich lat.

W bieżącym roku, ze względów organizacyjnych, Podlaski Kurator Oświaty zrezygnował z przeprowadzania dwóch konkursów w szkole podstawowej (plastyki i informatyki), mimo iż cieszyły się one dużą popularnością wśród uczniów. Zasadniczym powodem pozostawienia konkursu z języka białoruskiego była motywacja do nauki języka ojczystego wśród dzieci i młodzieży mniejszości białoruskiej.

Należy pamiętać, iż (podobnie jak z pozostałych przedmiotów) celem konkursu jest „promowanie uczniów **szczególnie** uzdolnionych" (Regulamin, rozdz. II, p. 1f, s. 4). Tytuł laureata konkursu przedmiotowego powinni otrzymywać uczniowie najzdolniejsi w województwie, reprezentujący wyjątkowo obszerną wiedzę przedmiotową. Co więcej, konkursy przedmiotowe nie powinny być jedynym, ani najważniejszym czynnikiem motywującym uczniów do nauki, a nauczycieli - do pracy z nimi. Dodatkowo, stawianie zbyt niskich wymagań wobec uczestników konkursów przedmiotowych również nie będzie stymulująco wpływać na jakość pracy szkół.

PODLASKI KURATOR OŚWIATY
mgr Jerzy Kiszkiel

Змест

Выдавец: Аб'яднанне ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА

Друк: Intropack Jerzy Iwaniuk

Zrealizowano dzięki dotacji
Ministra Administracji i Cyfryzacji

Месца для нататак